# Тут разумеюць...

## Сіла веры праз здымкі ізраільскага фатографа Дафны Таль

**Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры» запрашае наведаць выстаўку ізраільскага фатографа Дафны Таль «Цвёрдая вера: Праваслаўе на Святой Зямлі», прысвечанай 25-годдзю ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Дзяржавай Ізраіль і Рэспублікай Беларусь.**



Манах Ахілій, Капліца Ушэсця, Алейная гара, Іерусалім.

Дафна Таль нарадзілася ў Ізраілі. Таму яе стаўленне да веры заўсёды было сур'ёзным і ўсвядомленым. Над фотапраектам мастачка працавала больш за тры гады. Яна імкнулася паказаць сілу шматвяковай праваслаўнай веры і яе росквіт на Святой Зямлі, стаўленне людзей да рэлігіі. У выніку аказалася, што вера — паняцце настолькі глыбокае, што раскрыць яго за некалькі дзён немагчыма. Працэс патрабуе часу, абгрунтавання, уласнага асэнсавання. Аўтара зачапіла, як людзі могуць быць цалкам адданыя Богу, як знаходзяць прызначэнне ў служэнні яму.

На фотаздымках мы можам бачыць манахаў, святароў, паломнікаў, якія з'яўляюцца неад'емнай часткай сучаснага Ізраіля, а таксама прыгожыя манастыры, цэрквы, унутранае ўбранства храмаў. Фотамастачка не проста адлюстроўвае гісторыка-культурныя каштоўнасці сваёй краіны — разважае, як праз веру чалавек становіцца больш уважлівым да жыцця, з'яў прыроды і самога сябе.

На цырымоніі адкрыцця Дафна Таль адзначыла, што падчас стварэння праекта яна яшчэ больш пераканалася ў тым, што вера патрэбная чалавеку, гэта стымул да дабрыні. У Беларусь прывезці свой праект аўтарка вырашыла таму, што была ўпэўнена: тут яе зразумеюць.

Не памылілася. Фотаздымкі выклікалі вялікую цікавасць у сталічных гледачоў. Дафна Таль уражана, наколькі наведвальнікі зразумелі яе ідэю: многія падыходзілі і выказваліся наконт рэлігійных сувязяў народаў Беларусі і Ізраіля, цікавіліся месцамі, у якіх былі зроблены фотаздымкі. У будучыні аўтар плануе арганізаваць сумесны беларуска-ізраільскі праект.

**Вікторыя АСКЕРА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ